Канстанцін Тарасаў



...усе жадалі адзін аднаму дабра,
але гэтыя жаданьні
неяк фатальна не збываліся...

# Нячутныя гукі самоты

***Аповед***

Было далёка за поўнач, сон ня йшоў, не хацелася чытаць, чуць музыку, наогул рухацца. Сурын сядзеў ля расчыненага вакна і глядзеў, як высока ў начным небе пераможна зьзяе поўня. Цёмныя плямы на бліскуча жоўтым, ваяўніча збарвелым твары яе бачыліся Сурыну, як вочы адвечнага ўладара чалавечых таямніцаў.

Ніколі Сурын не адчуваў гэтак месячнае сьвятло. Цяпер поўня нібыта адухавілася і глядзела жорстка, як сьледчы на выкрытага злачынцу. Няўмольныя, прарэзьлівыя, пакепліва прыжмураныя, тыя вочы пільна сачылі менавіта за ім. Гэты кплівы позірк, нябёснае самотнае сьвятло неяк містычна адводзілі ад рэальнасьці, выклікалі з даўніны паўзабытыя постаці і падзеі, успамін пра якія адбіваўся смуткам.

Разам узгадаліся пасьляваенная Сьвіслач з крутым адхонам каля парку Горкага, з ільдом, празрыстым, нібы шкло, пад якім чародамі хадзілі бліскучыя

джгіры, і басейн за Домам Чырвонай Арміі, дзе ляжаў тварам да долу забіты чалавек, і парослы палыном, выпалены сонцам курган ля вёскі Рогава, і гулкае куваньне зязюлі ў зьдзічэлым за вайну лесе, і зыржавелыя крыжы на Кальварыйскіх могілках, і возера з чырвонай вадой, і чыесьці празрыстыя самотныя сьлёзы...

**1.**

Праз гэтае трывожнае мільгаценьне Сурын убачыў пакой, асьветлены сьвечкай, і, быццам адшукаўшы патрэбны цяпер для сэрца прытулак, пераступіў цераз парог і апынуўся ў гэтым пакоі, дзе ўсё было знаёмае да драбніцаў, бо тут прайшло яго дзяцінства. За вокнамі стаяла зімовая ноч, у шыбу парывамі біў вецер, перад печчу сядзела бабуля, адасоблена гледзячы на жывую чырвань агню, а ён, зусім яшчэ хлопчык, сядзеў на зэдліку побач і заварожана сачыў за зьменай аздобы на вугольлях – гэтак адрадзіўся ў памяці адзін з даўнейшых вечароў. Вечар ціхі, спакойны, можна лічыць шчасьлівы, бо ў большасьці былі яны тужлівыя... Бо тыдзень сямейнай ідыліі чаргаваўся з месяцам зьнішчальнага, як атрута, хатняга разбурэньня, калі бабуля зачынялася ў пакоі, раптоўна ахопленая тугой і жаданьнем адысьці на той сьвет. Яна адмаўлялася есьці, нерухома дзень пры дні ляжала ў ложку, углядваючыся ў расколіны на атынкаванай сьцяне, засяроджаная на горасным усьведамленьні: «Навошта жыць! Абрыдла жыцьцё!», ці, што было зусім невыносна бачыць, пачынала перабіраць у саламяным куфры свае рэчы, выкладаючы зьверху чорную сукенку, белую хустку, пантофлікі на нізкіх абцасах — убраньне на апошні шлях.

У такія дні ў пакой да бабулі ніхто не асьмельваўся заходзіць, гэта дазвалялася толькі яму, Сурыну, бо ён жыў разам з бабуляй, тут стаяў і ягоны ложак; ён прыносіў дровы, падаваў бабулі ваду, хадзіў па хлеб, калі было за што купіць. Грошы ад дачкі, а тым болей ад «яго» – ад зяця, бацькі Сурына – у гэтыя дні бабуля ня брала, а сваіх яна ня мела. Маці цішком давала Сурыну пяцідзесяцірублёўку; ён, крыху пастаяўшы на вуліцы, прыбягаў да бабулі і, выпраменьваючы радасьць, абвяшчаў: «Глядзі, бабуля, што я знайшоў!» Яна, адчуваючы нейкі падман, распытвала пра абставіны нечаканага божага клопату, Сурын, па-анёльску гледзячы ў чыстыя бабуліны вочы, хлусіў, яна верыла, і ён бег праз вуліцу ў орсаўскую краму па малако і булку. Усе звароты маці да развражнасьці бабулі толькі распальвалі ўзаемнае неразуменьне і боль. «Матуля, родная, ну чаму ты ня п’еш, не ясі, не гаворыш, – прасілася маці, – даруй нам, прабач, але не зачыняйся ў сябе, не катуй мяне!» – «Ай, дайце мне ціха памерці, – адказвала бабуля. – Я сышла б адсюль, толькі няма куды ісьці, прыснула недзе мая сьмерць!»

На стале ляжала недачытаная бабуліна кніга. Сурын ведаў, што на вокладцы чорнымі літарамі напісана «Петр Первый». А на чыстай старонцы, адгарнуўшы вокладку, Сурын чытаў рукой бабулі занатаваныя радкі: «И грустно, и больно, И некому руку подать В минуту душевной невзгоды». Сурын адчуваў, што ўсе гэтыя словы сумныя, але не разумеў, што такое «невзгоды». А спытацца ён ня насьмельваўся. Так ніколі

і не запытаўся, пакуль праз пару дзесяцігоддзяў сам не зразумеў горасны сэнс тых радкоў.

На нейкім дні адасабленьне завяршалася прыступам – бабуля губляла прытомнасьць, на скроні жахліва надзімаўся крывяны мяшок. Сурын спалохана імчаў да бацькоў: «Бабуля памірае!» Хутка ля пад’езду вішчалі тармазы белай у чырвоных крыжах карэты, блішчаў шпрыц, бліскаў скальпель, з вены струменілася ў міску цёмная кроў, да шыі і скроняў ставілі вёрткіх, галодных п’явак – яны павольна напухалі. Потым медыцынская сястра, трохі брыдзячыся, здымала крывасмокаў, і да абяскроўленай, зьнясіленай бабулі вярталася жыцьцё; бабуля ня памятала, як жыла і што рабіла ўвесь папярэдні прыступу час. Дактары “хуткай дапамогі”, пакідаючы дом, лянотна тлумачылі бацькам: скляроз, абцяжараны кантузіяй, медыцына бездапаможная...

## 2.

Цяпер Сурын разумеў, што належала тлумачыць інакш: няўдача жыцьця, абцяжараная гаротнымі стратамі.

Страта роднага чалавека і ёсьць невылечная кантузія. Упершыню бабулю кантузіла сьмерць яе малодшай сястры. Потым – гібель мужа. Потым загінуў стрыечны брат, а ў вызвольным паходзе трыццаць дзевятага году страціўся зводны брат, самы ёй дарагі. На трэцім дні апошняй вайны пад абломкамі гатэлю “Еўропа” зьнікла найдаўняя сяброўка. А хутка і сама бабуля стала ахвярай бомбы. Апоўдні нечакана наляцелі нямецкія самалёты, усе пасьпелі схавацца ў шчыліну на гародзе, толькі бабуля забавілася на кухні, і раптам – жудаснае, невыноснае для слыху выцьцё, і ля ганку ўзьнялася слупом зямля. Хата скаланулася, павылятала шкло, усе вянцы, дах, падмурак, падлога на нейкі момант сілай выбуху ўзьняліся, разьядналіся і зноўку злучыліся, але ўжо ня так, як ляжалі раней: усё было перакошана, пакрыўлена, скасабочана, адныя дзьверы не адчыняліся, іншыя не зачыняліся, на сьцены, прабітыя, пашчапаныя асколкамі, лёг адбітак ледзяной таесьветнасьці.

Бабулю асколкі абмінулі, але на імгненьне яе душа, памяць, усе нярвовыя, мазгавыя клеткі разьядналіся, кожная пабыла сама па сабе, а калі спалучыліся, дык шмат што аказалася скажоным. Левае вока выглядала здаровым, але бабуля нічога ня бачыла ім апроч нейкага белага ценю – таго прывіду сьмерці, які не дабіў яе пры выбуху. Памяць ня згасла, але працавала нейкімі пошугамі. Галава трымалася на плячах роўна, але ўнутры нешта сплясканае, падзёртае ўдарам выбуховай хвалі безупынна пакутвала болем; магчыма, там стаяла балотцамі незапечаная кроў, якую пакрывалі, нібы раска, абрыўкі нярвовых клетак. Думкі і пачуцьці грузьлі ў гэтых балотцах, страчвалі пачатковы напрамак і выгляд, зьяўляліся на сьвет іншымі, чым узьнікалі...

А пасьля гэтай бяды давялося адпакутваць тры гады акупацыі, калі неадступна кроіў сэрца жах: забяруць немцы дзяцей ці не забяруць, адправяць у Нямеччыну ці не адправяць, высмакчуць з іх кроў для сваіх салдатаў ці не зачэпяць, пагоняць у Трасьцянец, як людзей з суседняй вуліцы ці не пагоняць, апынецца іхні дом пры карных расстрэлах дзясятым або пашанцуе. А пры бамбёжках, калі бурыліся камяніцы, гарэлі

хаты, і жыцьцё цалкам залежала ад цуду, трэба было скамянеўшы чакаць, адбудзецца гэты цуд ці не адбудзецца. І кожны дзень пачынаўся з пытаньня: што есьці згаладалым дзецям, памруць яны ад голаду ці не памруць?

А перад усімі гэтымі пакутамі, адразу пасьля той бамбёжкі, пусьціліся яны наўцёкі з Менску на ўсход, па Магілёўскай шашы: сямігадовая сястра вяла асьлеплую бабулю, дзевяцімесячнага Сурына маці несла на руках, а зьверху калону ўцекачоў палівалі кулямётным агнём нямецкія самалёты. Вось хвілю назад бегла побач жанчына з дзіцем, а ўжо ляжаць яны, выплывае з дзіцяці і жанчыны страшная кроў на зялёную траву. Дзе іх пахавалі, задумвалася потым бабуля. Відаць, пры дарозе скінулі ў якую яміну, і ляжаць там усімі забытыя. Зьніклыя бяз весткі ахвяры. Бо тыя, хто ўцякаў, не хавалі забітых. Беглі, спадзяваліся, што хутчэй бягуць, чым немцы едуць. Дацягнуліся да Сьмілавічаў, да бабулінай сястры, але і там не знайшлі ратунку, праз тры дні давялося брысьці назад. Сястра сказала бабулі: "Уцякай Эдзя, тут мясцовыя вас заб'юць і нас не пашкадуюць". І зноў сорак вёрст у Менск растаптанымі ў крывавае мяса нагамі…

І цягнулася катаваньне жыцьця, пакуль ня вызвалілі Менск нашыя танкі. Сьвята!... Але столькіх людзей вынішчыла ліхалецьце, што бабулі ў гэтым адроджаным жыцьці цяжка было прыжыцца. Яна намагалася зразумець выснову чалавечага зьверства, якое ў абгон натуральнай сьмерці люта скрышыла большасьць яе родных. Ды і тыя, хто памёр бяз гвалту, сьмерцю ўласнай, звычайнай, пражылі да крыўднага малы век. Іх цені, нябачныя нікому, апроч яе, набіваліся ўвечары ў пакой. Патушыўшы лямпу, бабуля апавядала Сурыну іхнюю і сваю даўніну.

Часта прыгадвала яна стук у шыбу – тры ўдары пальцамі. Магчыма, яна і не хацела расказваць пра тое змрочнае здарэньне свайму маломy слухачу, а забыўшыся на яго прысутнасьць, успамінала ўголас, бо хто ж будзе страшыць унука цёмнымі таямніцамі наўмысна? Яна, пэўна, ужо і не адрозьнівала, што тут страшнае, што звычайнае; гэта былі памятныя вехі ейнага жыцьця, у гэтую хвіліну толькі яны паўставалі перад вачыма, і меўся застацца хоць нейкі сьведка, нейкі нашчадак мусіў прыняць гэтую спадчыну – ім быў Сурын.

Можа, той стук у шыбу згадваўся ёй таму, што ночы здараліся такія ж зорныя, і зялёнае сьвятло месяца клалася на падлогу, як у журботны для яе час першага знаёмства з горам. Бабуля апавядала, і плынь сумных словаў пераносіла Сурына ў засьценак пад Сьмілавічы, у старую хату, дзе ў куце туліліся адна да адной чатыры дзяўчынкі, а на ложку канала іх маці. Было ціха, як толькі можа быць ціха ў хаце, калі ўсё навакольле сьпіць, а тут з жахам прыслухоўваюцца да саслабелага, ледзь чутнага дыханьня роднага чалавека. Раптам злосна забрахаў сабака, і праз момант пужліва захліпнуўся і заскуголіў. І ўсе зразумелі, што ён схаваўся. Айчым выйшаў з хаты, нясьмела паклікаў "Хто? Хто тут?", вярнуўся і, неяк сам сабе не даючы веры, заспакоіў: "Нікога!" Але толькі прагучала гэтае супакойлівае слова, як пачуліся лёгкія крокі, наблізіліся да хаты, і ў шыбу тройчы стукнула чыясьці рука. Пабляднелы айчым сказаў: "Гэта яна!" Гэта сьмерць вызначыла свой час. А трэцяй гадзіне ночы бабуліна маці сканала.

3.

Айчым пакінуў пры сабе агульных з маці хлопцаў, а дачок ад першага шлюбу сваёй жонкі раздаў па ейных сваяках. Сёстры разлучыліся, і таму, што ім змалку давялося спазнаць няшчасьце, яны шчымліва любілі адна адну, і калі сустракаліся, дык плакалі ад радасьці, што сустракаюцца, і ад крыўды на лёс, які пазначыў іх бядой. Яны марылі пра адно і тое ж: простая іх мара зводзілася да цуду – маці ўваскрэсьне, усе яны зноў будуць разам, маці будзе цалаваць іх, яны будуць лашчыцца да маці, і хата стане падобная на рай, дзе анёлы сьвяткуюць шчасьце. Але міналі гады, ад мары заставалася толькі журба, час вывеў да дарослага клопату, і наканаваныя няшчасьці пачалі збывацца.

Малодшая з сясьцёр – яе звалі Вольга – сама абарвала сваё жыцьцё. Што гэта было за трагічнае каханьне, хто быў той чалавек, без якога Вольга не захацела жыць далей, бабуля не казала. Засталіся ў памяці асобныя выпадковыя словы, з іх цьмяна вынікала, што Вольга закахалася ў маладога ксяндза з ігуменскага касьцёлу, і гэты ксёндз ці не хацеў, ці не асьмельваўся пакінуць касьцёл дзеля людскога жыцьця. Ды што мог разумець у такіх адносінах дарослых людзей малы хлопчык? Ён найбольш шкадаваў бабулю, якая не забывалася на страту сястры. Ён і цяпер, дарослым, не знайшоў бы дакладнага адказу. Разумныя разважаньні ня маюць перавагі над пошугамі пачуцьцяў. На якіх вагах узважыць чужы боль? Відаць, быў ён нясьцерпны, калі вынікам сталася самагубства.

Сурын з бабуліных споведзяў ведаў месца, дзе тая трагедыя адбылася. Каля менскага тэатральнага скверу стаяў некалі трохпавярховы дом; у тым зьніклым у часе вайны будынку бабуля з мужам здымалі кватэру. На другім паверсе. А першы займала кавярня пана Венкжэцкага. З яго жонкай бабуля сябравала, а ў кавярні працавала эканомкай. У той горасны вечар яна з мужам пайшла ў сквер да фантану. Струмень вады вылятаў з горла лебедзя і з шумным плёскам падаў з вышыні ў круглы басейн. Лёгкая вільгаць каля фантану прыемна прахалоджвала. Нішто не прадказвала няшчасьця. Аднак у той неіснуючай цяпер кватэрцы сястра Вольга ўжо прыняла атруту…

Адыход Вольгі з жыцьця адбіўся вечнай пакутай на сумленьні сясцёр – яны дакаралі сябе, што ня здолелі зьберагчы малодшую, недагледзелі, як гэтакае рашэньне ў яе высьпела, як душа яе пакутавала, а розум і воля напружваліся перамагчы жах, а потым, у самую гаротную хвіліну, калі адзінае слова, хоць бы простая прысутнасьць чалавека ў суседнім пакоі зламалі б рашучасьць дзеяньня, нікога не аказалася ў кватэры – Вольга адзінокая стаяла ў цемры свайго асляпленьня... А яшчэ, што не давала супакоіцца, дык гэта памяць пра нескарыстаную магчымасьць, ці не галоўную, і неаспрэчна вышняй сілай падказаную. Перад тым як выйсьці на прагулянку ў сквер прыцягнуў увагу бабулі выцягнуты з-пад ложку чамадан Вольгі. Нечым ён зьдзівіў яе, і бабуля падумала, нават, адчула, што трэба раскрыць яго і зазірнуць. І ўжо нейкі рух быў да гэтага, але яна спыніла сябе развагай, што нешляхетна разглядаць без дазволу чужыя рэчы, хоць яны і роднай сястры. А ў тым чамадане ляжала атрута. І калі б бабуля зазірнула, мажа, і не было б трагедыі...

З сямейнай спадчыны мела бабуля толькі настольны абразок Маці Божай Вострабрамскай. Гэта была сярэбраная, вялічынёй з медаль, выява, прымацаваная да пласьціны з зялёнага непразрыстага бурштыну, а тая – да бронзавай падстаўкі. Абразок гэты стаяў у бабулі на стале побач з кнігай і павелічальным шклом, якім бабуля карысталася пры чытаньні. Сурын ня памятаў, каб бабуля малілася на абразок ці каб наогул малілася. Магчыма, яна малілася пра сябе ўпотай. З яе словаў вынікала, што пасьля трагічнай сьмерці сястры, яна ў касьцёл не заходзіла, але яе дачка, маці Сурына, была ахрышчаная ў касьцёле Усіх Сьвятых у Коўне, дзе па нейкіх абставінах бабуля сваю дачку нарадзіла. Наўрад ці мела сэнс дашуквацца дакладнасьці. Нічога не магло гэта зьмяніць у хроніцы даўніх падзеяў. У касьцёл бабуля не хадзіла, але верыла, што там, у вышнім сьвеце, усіх сустрэне. І абразок быў напамінкам аб зьніклым доме, зьніклай маці, сям'і, як тая агульная маёмасьць, на якой засталіся подыхі і шэпт маці, сястры, бацькі, пах роднага дому, адбіткі дзіцячых мрояў і самотных сьлёз, якімі аплакваюць забраных на той сьвет.

**4.**

Сярод такіх забраных дачасна апынуўся і муж бабулі, дзед Сурына, якога Сурын ня мог сабе ўявіць, бо ўсе старыя здымкі згарэлі ў доме, на які ўпала нямецкая бомба. Ён загінуў у 1915 годзе, жнівеньскім ранкам, недзе на балотах паблізу Ясельды, дзе праходзіў тады фронт. Тым ранкам нікому з салдатаў менскага палка не пашчасьціла даўмецца, што нібыта звычны малочны туман над балотам, які напаўзае на іх акопы ад нямецкага боку, – новы сродак для зьнішчэньня жыцьця. Ніхто ня кінуўся бегчы, усе паспыталі магільны пах гэтага туману, а потым атручаныя лёгкія лопаліся, горлам цякла кроў, і дыхавіца выкошвала людзей больш надзейна, чым кулямёты. Удзень ветрык разьвеяў пякельную завесу, мёртвых сьцягнулі ў яму, закідалі торфам, і ўжо сьлядоў не засталося ад той брацкай магілы...

Тады газеты друкавалі сьпісы палеглых, параненых і ўганараваных баявымі крыжамі. Вось бабуля і знайшла імя мужа ў жалобнай калонцы. Дзеду было трыццаць гадоў, рослы, дужы, неабыякавы да жаночай увагі, што заўжды напаляла бабуліну рэўнасьць, ён зьнік у палескай багне, і бабуля стала ўдавой з асірацелай дачкой, і стала старой... Некалі яна абмовілася, што магла застацца з двума дзецьмі, ды першае немаўлятка – сынок з імем Рамуальд – памерла на трэцім месяцы жыцьця. Засталася аб ім хіба памяць, як насіла і нараджала… А другое дзіця зьведала бацькаву ласку да пяці год, пакуль ён не патупаў у казармы на Старажоўку па форму і трохлінейку, а потым у калоне такіх жа ахвяраў – на Брэсцкі вакзал, адкуль цягнік паімчаў іх у бок Палесься пад музыку духавога аркестра. Модным тады быў марш "Разьвітаньне славянкі". Бабуля не магла яго спакойна чуць да канца свайго веку, сьлёзы цяклі ў яе з вачэй ад гэтых урачыстых гукаў…

Ужо ні тых людзей, ні іх каханьня, але ўсё роўна шчыміць сэрца, што так загасалі пачуцьці, накладаючы нядобры адбітак суму на людзей свайго і наступнага калена.

**5.**

Барвовыя промні поўні асьвятлялі дзьве самотныя постаці ў часовай далечыні – у зімовую ноч, у нейкім падвале, прытуленых да буржуйкі, і Сурын упершыню зразумеў, чаго каштавала жыць і выжыць у чарадзе тых наступных жорсткіх гадоў – ваенных, рэвалюцыйных, акупацыйных, аднолькава бязьлітасных, галодных, вынішчальных. Як шчасьлівыя хвіліны сярод застыласьці бедстваў, узгадвала бабуля зьяўленьне ў падвале свайго зводнага брата Антона. Ён заўжды быў вясёлы, прырода так захацела, каб на сумную іхнюю сям'ю быў чалавек іншай натуры. Антон прыносіў з сабой дошку, недзе скрадзеную ці адарваную ад нейкай грамадскай уласнасьці, часам гэта былі дошкі ад драўлянага вулічнага насьцілу. Буржуйка хутка распалялася, на ёй кіпеў вар, Антон сьпяваў, прымушаючы іх падпяваць, і вось гэтае простае шчасьце маляваў Сурыну голас бабулі ў цішыні ночы.

У трыццаць сёмым годзе Антон зьведаў дзіўную прыгоду ў НКУСе. Змрочная ўстанова выклікала яго да сябе тэлефонным званком на вуліцу Урыцкага з гатэлю "Еўропа", дзе Антон працаваў шэф-поварам. Ён прыйшоў, у дзяжурнага яго чакаў пропуск, ён падняўся, як было загадана на другі паверх і апынуўся ў неасьветленым, як склеп, калідоры. Ён ткнуўся ў нейкі кабінет, дзе яму жорстка параілі сесьці на калідорную лаўку і чакаць. Праз гадзіну з кабінету ў канцы калідору выйшаў рослы чалавек і ўпэўнена закрочыў да Антона. Хто ён – разабраць у цемры Антон ня мог. Праходзячы міма службовец спрактыкавана заехаў Антону ў вуха, і пакуль у галаве стаяў звон ад нечаканага ўдару, ён зьнік недзе ў адным з кабінетаў. Яшчэ праз гадзіну чаканьня адчыніліся іншыя дзьверы і наколькі Антон мог разьбіраць па кроках, гэта быў іншы чалавек. Аднак і ён, мінаючы Антона, заляпіў яму такой сілы аплявуху, што кроў пырснула з носу. А яшчэ праз гадзіну ў калідоры зьявіўся трэці службовец. Гэты, аднак, ня біў, а ветліва запытаў, што грамадзянін тут робіць? Антон адказаў, што выкліканы і чакае. "Не, не, – сказаў ветлівы, – можаце ісьці!" Нашто выклікалі, хто біў па твары, дзеля чаго – гэтак і засталося нераскрытай загадкай.

А праз два гады Антона мабілізавалі для ўдзелу ў Вызвольным паходзе. 17 верасьня войскі перайшлі мяжу, Заходняя Беларусь далучылася да савецкай, а на пачатку кастрычніка ў Слоніме нейкі невядомы змагар за польскія крэсы здолеў падсыпаць у салдацкі кацёл атруты. Сярод дзясятку ахвяраў учыненага акту апынуўся і Антон, пазначаны, дарэчы, у пашпарце палякам. Паездкі на далучаныя землі не дазваляліся, і нават магілкі свайго брата бабуля не пабачыла. Прынесьлі паведамленьне пра самаадданую сьмерць у вызвольным паходзе, і яно прабіла ў душы яшчэ адну дзірку.

А потым здарылася кантузія ад нямецкіх бамбавікоў. Адна з бомбаў, прызначаная разбурыць пажарнае дэпо на Старажоўцы, праляцела лішнія сто крокаў. Дэпо на Краснай вуліцы стаіць і па сёньняшні дзень, а хаты той, зьнішчанай агнём, з таго дня ня стала, на месцы двара, дзе спаў у калясцы Сурын, стаіць корпус радыёзаводу "Гарызонт". Няма і бабулі, ніхто і ня ведае, што тут было, і каму тут калісьці не пашанцавала.

**6.**

Бабулю зламала вайна, але зачэпкі для пакутлівага адасабленьня адшукваліся дома. Зяць не любіў жывёлу ў хаце. Між тым па насьценным дыване, па фіранках, гардзінах мітусьліва насілася вавёрка, пад шафай кватараваў вожык і ўначы згодна з дробнаўласьніцкім інстынктам зацягваў да сваёй гаспадаркі ўсё, што мог, часьцей за ўсё чамусьці бацькавы шкарпэткі. У студзеньскія маразы з павеці перасялялася на кухню каза, а калі ў яе здаралася казьлянятка, дык і яно спрабавала там свой голас. Сабачка шукаў па пакоях вожыка, каб укалоцца лапай і пакрыўджана скуголіць. Зьяўляліся і зьнікалі валацужныя каты. Ім падабалася спаць на кухні на цёплай печы. Варта было бацьку падыйсьці да ўмывальніка, як з печы саскокваў разбуджаны, абураны, ашчэраны кот. Ці ноччу, вяртаючыся з працы, праходзячы на дыбачках сенцы, бацька незнарок наступаў ботам на хвост дрымотнаму кату, і прарэзьлівы, як сірэна, віск падымаў усіх з ложкаў. “Скуралуп!” – стагнала бабуля.

Хоць хата поўнілася дзёрзкімі катамі, не пераводзіліся, а наадварот, нахабнічалі мышы. Нават у сьветлы час яны высоўваліся з дзірак, бясстрашна перабягалі пакой на вачах ката. Кот быў адвучаны бабуляй ад паляваньня, бо як толькі яна прыкмячала яго падрыхтоўку да агрэсіі, адразу ж яго чакала пакараньне. Бацьку злавала, што кот не варушыцца, выдаючы сябе за сьляпога, але ён змоўчваў. Пэўна, разумеў, што за гэтым дзіўным міралюбствам, створаным штодзённай дрэсіроўкай, стаяла ўпартае бабуліна жаданьне жыцьця для ўсіх. Такі сьветапогляд наўрад ці адпавядаў яго мужчынскай натуры; тым большую вартасьць мела ягонае цярпеньне. Казьліныя морды на кухні нагадвалі бацьку змрочнае вясковае дзяцінства, калі ў піліпаўскія маразы пераходзілі ў хату авечкі, памыквала ля печы цяля, павісквалі ў падпеччы парсючкі. З той хаты бацька вырваўся, тут жа з казой, вожыкамі, сабачкамі, бандай катоў прыходзілася лічыцца, як са сваякамі, бо для бабулі сьвет аздобліваўся іхнімі галасамі, гульнямі, пяшчотай, наогул, яна іх ачалавечвала, ва ўсялякім выпадку, адухаўляла.

Дзелячы з бабуляй гаспадарчы клопат – дойка і стрыжка казы, назапашваньне для яе сена – Сурын не разумеў бацькоўскай непрыхільнасьці да істотаў, якія, на яго думку, адрозьніваліся ад людзей толькі абліччам і мовай. Яму падабалася, калі каза ў сваё зімовае кватараваньне з цікаўнасьцю блукала па пакоях, намагалася зьесьці фіранку ці баднуць у вялікім трафейным люстры свайго двайніка. Бацька ж, калі да яго ў пакой зьяўлялася рагатая госьця, застывала каля стала, з прагнасьцю аглядаючы стос папераў – бацькаву кандыдацкую, адчуваў тугу і агіду. Іншым разам, шкадуючы бабулю, ён перамагаў жаданьне штурхнуць казу ў бок, але часам нервы яго не вытрымлівалі, каза наўгалоп вылятала з пакою і плаксіва скардзілася на гвалт. Пакутніца запрашалася ў бабулін пакой, і Сурын частаваў яе хлебам, каб яна не падавала прыкметаў свайго існаваньня, і дом улагоджваўся і заціхаў...

Можа, моцныя маразы і ня гэтак часта здараліся, тыдзень на год, пэўна, ня болей, а ў астатнія дні каза і казьлянятка месьціліся ў хлеўчуку. Адзін кут яго займаў з вясны да першых маразоў кабанчык. Такіх хлеўчукоў на двары было восемдзесят – па ліку кватэраў у самым вялікім

на той час жылым доме гораду. Кабанчыкаў гадавалі ўсе. А вось казу трымала толькі бабуля. Хляўчук стаяў крокаў за сто ад пад'езду. Ранкам і ўвечары Сурын дапамагаў бабулі карміць кабана і даіць казу. Іншым разам, калі бабуля кепска пачувалася, ён і сам даіў. Яшчэ ён трымаў казу за рогі, калі бабуля вычэсвала пух. З гэтага пуху яна вязала цёплыя бярэцікі і шарфікі для знаёмых, а сабе вязала хустку. У той час Сурыну падаравалі фотаапарат "Піянер", і ён зрабіў здымак – бабуля ў гэтай хустцы стаіць на фоне дваровых хлеўчукоў. Шмат гадоў пазьней Сурын пашкадаваў, што зрабіў толькі адзін здымак.

Так даўно ўсё гэта было, што, здаецца, насамрэч і не было, а склалася з абрыўкаў дзіўных сноў. Жывуць у той кватэры іншыя людзі, разбурана тая печ, каля якой у маразы грэлася каза, са шматлікіх сьведкаў тых дробных падзеяў засталіся адзінкі, і час няўмольна разьвейвае памяць. А зьбіраецца ўсё разам адзін можа раз на дваццаць гадоў, калі пры сьвятле поўні раптам наважацца нагадаць пра сябе забытыя цені і адкрыць даўнія таямніцы сваіх дзён і пачуцьцяў.

**7.**

З надыходам ночы ў бабулінай памяці абуджаліся карціны мінулага веку, падзеі рознай значнасьці, ці наогул казачныя паданьні з ігуменскага старасьвецкага ўжытку, якія Сурын па дзіцячай веры ў цуд лічыў за дзіўную праўду жыцьця. За большую праўду, чым аповяд пра падставы заіканьня дзядзькі, якога добра ведаў, і таму ня мог асэнсаваць яго моўную загану як драму. Найбольш яго тады ўразіла апавяданьне бабулі пра возера каля Ігумена, якое затапіла стары горад, і калі ў сонечны дзень плыць па возеры на лодцы, дык у глыбінях можна ўбачыць стары касьцёл, старыя дамы, рынак і гарадскія брамы. Сурыну тады здавалася, што і людзі ходзяць там, пад вадой, у касьцёл, на рынак, гуляюць па вуліцах, і сабачкі бегаюць па вуліцах, а ў садах высьпяваюць жоўтыя сьлівы. Так яму потым сьнілася. Магчыма, бабуля, пераказвала яму гісторыі, што сама чула ў дзяцінстве ад сваёй бабулі ці ад цёткі, і паўтарэньне якіх пераносіла яе з адзіноты старасьці ў кола колішніх сяброўак і даўно зьніклых сваякоў.

Адно з гэтых апавяданьняў Сурын запомніў слова ў слова. У ігуменскага пана была малпа, якую ён надта любіў. Аднойчы пан захварэў на ангіну, дактары не маглі даць рады, пан страчваў дыханьне і відавочна канаў. Бачачы блізкую сьмерць гаспадара, слугі пачалі заходзіць у пакой да сьмяротна хворага і кожны браў нешта ўпадабанае з шафы, шуфлядаў, куфраў. Малпа назірала гэты заклапочаны чалавечы рух, і нарэшце, натхнёная прыкладам служак, пачала аглядацца, што б зьнесьці ёй. Але ўжо было вычышчана, і тады малпа выцягнула з-пад панскага ложка начны посуд і рушыла да дзьвярэй. Тут пан ня вытрываў, зарагатаў – гнайнікі палопаліся, ён уздыхнуў на поўныя грудзі і ачуняў. Усё гэта было б падобна на прастадушную казку, калі б ня сумны канчатак гісторыі, які прымушаў сэрца Сурына жахліва сьціскацца.

Тужлівы працяг забаўнай гісторыі быў такі. Пан ачуняў, падняўся, перапужаныя злодзеі павярталі нарабаванае, і ўсьлед за імі малпа паставіла на ранейшае месца гаршок. Зразумела, пан прагнаў з двара ўсю сваю непрыстойную прыслугу. Малпа ж як выратавальніца жыцьця

набыла ў хаце правы каралевы. Яе апраналі ў паркалевыя сукенкі і сьпецыяльна заказаны майстру саламяны капялюшык з букецікам кветак аздабляў яе галаву ў падабенства мясцовым паненкам. Ды аднаго дня малпачку знайшлі ў садзе забітую насьмерць – нехта з тых слугзлодзеяў не ўтрымаўся ад граху забойства. Такую помсту зьведала ад іх бедная істота, апранутая ў белую сукенку, даверлівая, наіўная, з капялюшыкам на галоўцы, у якой было менш злосьці, чым у людзей.

Праз шмат гадоў Сурыну давялося пабываць у тым Ігумене. Ходзячы па вулках, стоячы каля старой купы дрэваў, дзе некалі мог стаяць панскі дом, уявіў ён постаць безабароннай жывёліны. Можа і не было яе тут ніколі, і гэта толькі забаўка для дзяцей, але ж нехта тут уяўляў сабе тую малпу, яе сукенку, злодзеяў, сьмяяўся, а пасьля спачувальна плакаў, як пазьней сьмяяўся і плакаў ён.

Часам у зімовыя вечары гуло ў пакоі верацяно – бабуля з нітак і казінага пуху вырабляла пражу. Козаў на памяці Сурына бабуля ўзгадавала і глядзела дзьвюх. Першая была ангорскай пароды, прывезеная аднекуль з Аўстрыі ў якасьці ваеннага трафею. Сурын дапамагаў бабулі гэтую казу стрыгчы. Аднойчы ноччу гэтую трафейную казу скралі. Міліцыянты з сабакам прайшлі апошнім шляхам ангорскай прыгажуні на суседнюю вуліцу, дзе сабака страціў сьлед. Сьледчы зрабіў выснову, што казу ўзялі на машыну, і што ўкралі яе цыганы. Чаму цыганы – ніхто ня ведаў, але гэта пераконвала, бо крыху раней цыганкі пакралі ў некалькіх кватэрах паліто і шапкі – тое, што пасьпелі схапіць, ступіўшы ў сенцы. Казу, меркавала бабуля, цыганы ўзялі ў табар, каб паіць карысным малаком цыганятаў. І Сурыну доўга ўяўляліся зорныя ночы, табар у полі, вогнішча, цыганы сядзяць і пяюць свае цыганскія песьні, якія ён ведаў з даваенных пласьцінак з запісамі Лялі Чорнай, а каза стаіць наводаль, слухае рамансы задаволеных злодзеяў і сумуе па бабулі і па ім.

## 8.

Потым бабуля памерла, і адбылося гэта так, як некалі нагадала ёй цыганка: “Ты памрэш ходзячы”. Удзень бабуля ўзялася гатаваць, падышла да печы і раптам з болем выгукнула імя дачкі – гэта быў яе апошні зварот на сьвеце. Голас бабулі перастаў гучаць у хаце, не закалыхвалі больш Сурына таямнічыя апавяданьні, ад чаго доўгі час былі жахлівымі яго сны. Недачытаная кніга “Петр Первый” перайшла на паліцу этажэркі, абразок Маці Вострабрамскай схавалі ў куфэрак. У сьцяну ўбілі цьвік, на ім трымаўся ўзяты ў рамку здымак бабулі ў пуховай хустцы на фоне хлеўчукоў…

Тут бы і наблізіцца Сурыну да бацькі, але на гэты час канчалася яго маленства – ён закахаўся, яго прымала жыцьцё, дзе чужыя людзі бяруць верх над бацькамі. Такім чалавекам, які адрываў яго ад сваякоў, была аднаклясьніца па імені Ада. Што бацька мог супрацьпаставіць гэтай малой дзяўчынцы, каб утрымаць сына пры сабе? Ён быў бездапаможны, бо праз гэтую Аду зьдзяйсьняўся покліч да таямніцы каханьня. Сіла таямніцы адразу пасунула бацьку ўбок, толькі кроплі сыноўскай увагі выпалі на ягоную долю... І таму шмат што з бацькавых учынкаў і бацькавых словаў памяць не ўтрымала. І зараз гэта балела…

Памяталася, як на кургане каля вёскі Рогава бацька, тужліва расьціраючы ў пальцах сьцяблінку палыну, расказваў пра свайго брата Сямёна. Тады бацькоўскі боль не закрануў Сурына, можа, ледзь-ледзь, зьверху сэрца. Ён хвілінку паспачуваў бацькаваму настрою, занатаваў у памяці некаторыя падзеі з жыцьця, увасобленага пад імем “Сямён”, і бадай што, адразу на іх забыўся. Яму было дзесяць гадоў, ён ведаў жывых людзей, а тыя, што адышлі даўно, пра якіх гаварылася ў мінулым часе, здаваліся неверагоднымі, як бы наўмысна прыдуманымі, як героі казак. Ён і ня мог зразумець, яшчэ ня ўзьнік пралом у душы, не стварылася гаротная памяць пра тых знаёмых, каго ўжо не дазвацца, не даклікацца, хто прыходзіць у снах, хвалюе сэрца, а калі расплюшчыш вочы, азірнешся – нікога побач, пуста, сум...

Бабуля сканала ў сьнежні, і праз дваццаць гадоў у сьнежні памёр бацька; пылком абсыпаўся іней, бела і чыста было вакол магілы, куды апускалі на вечны спакой яго, які перайшоў жыцьцё насуперак крыўднаму лёсу і перамог сваё калецтва. Стаў ён калекам на пятым годзе, калі, гуляючы з братамі, зваліўся з печы. Маці і бацька палічылі, што ён неўзабаве памрэ, і не павезьлі дзіця да фельчара, нават не запрасілі да яго якую мясцовую шаптуху. На дзіва малы ачуняў і праз некалькі месяцаў выйшаў да сваіх аднагодкаў прыкметна паменшаны ростам, з галавой, асаджанай у пакрыўленыя грудзі. Маці была ладная жанчына і брыдзілася маленькага гарбуна, асабліва на людзях, нібыта тлумачыла ім: вось жа, заслаў чорт да маёй хаты такое няшчасьце. Калі б вёска магла ведаць наперад, што гэты малы выб’ецца ў людзі, да яго ставіліся б лепш, але паколькі ніхто ня ведае будучыні, і мала хто дазваляе сабе думку, што дух калекі можа быць мацнейшы за дух нескалечанага, то ён добра зьведаў зьнявагу, з лішкам пазнаў, як жорстка могуць рыхтаваць чалавека да пакоры, ціхмянага цярпеньня вечнага бедства, калі вызначылі яму статус няўдачніка.

Былі ў яго сябры. Праўда, няшмат, два. Лепшым сябрам стаў малодшы брат Сямён. Бацька пакінуў вёску ў трыццаць другім годзе, у самы распал калектывізацыі, Сямён – годам пазьней. І сувязь з раднёй браты перарвалі, бацька Сурына наогул не наведваўся ў родную хату, не прасіў там каша бульбы, ды і пра яго быццам забыліся, выкрэсьліўшы з сямейных сьвятцаў: выдужыць студэнцкую галечу – яго шчасьце, зламаецца – дык таго і шукаў. Сямён загінуў за месяц да вызваленьня Віцебшчыны паблізу Езерышчаў у сутычцы з карнікамі... Другі бацькаў прыяцель на вайне ацалеў. Сурын аднойчы бачыў яго, калі бацька вырашыў наведаць радзіму. Той даўні сябра быў у той час брыгадзірам, яны ўзялі коней і конна паехалі гразкім багністым прасёлкам у сваю родную вёску, дзе помнікамі смутку стаялі абмытыя дажджамі, напаўзруйнаваныя коміны. Пасьля, ужо дарослым, Сурын даведаўся, што гэтую бацькоўскую вёску зруйнавалі танкі нямецкай 12-й танкавай дывізіі. Усяго зьнішчылі яны пяцьдзясят вёсак раёну, а называлася гэтая акцыя “Клетка для малпаў”. Бацька з сябрам хадзілі па зарослай вуліцы, прыгадваючы, хто дзе жыў, нарэшце, вылічылі свае двары – пустазельле, комін пасярэдзіне, ніякіх рэштак ад пабудоваў, ад хатаў, дзе яны нарадзіліся. Гэтая зруйнаваная немцамі вёска называлася Горкі.

Побач з вёскай ляжала возера Каць – круглае, як поўня, з нейкай незвычайнай, наскрозь барвянай вадой. Сурын быў малы і зьдзівіўся:

“Адкуль тут кроў?” “Зямля плача!” – адказалі яму мужчыны ў лад свайму суму. І Сурына надоўга захаладзіла думка пра затоенае ў лесе сховішча крывавых сьлёз зямлі.

**9.**

Тое падарожжа на зруйнаваную радзіму бацькі адбылося летам, а тое лета сталася апошнім у жыцьці бабулі. Па вяртаньні Сурын атрымаў ад яе гасьцінец – цукровыя падушачкі рознага колеру. Хоць бабуля і хавала іх у печы – найменш нагрэтым месцы ў доме за адсутнасьцю ў тыя часы халадзільнікаў, падушачкі зьлiпліся ў камяк. З гэтым салодкім набыткам ён пайшоў на двор шукаць сяброў. Бабуліна каза спала ля хлеўчука, сябры ў цені пад плотам гулялі ў ножыкі, ён пачаставаў іх падушачкамі, яго аддзячылі слівамі, сабранымі з пэўнай рызыкай у нечым садзе на суседняй вуліцы, якая называлася “Льва Талстога”. Усё было трывала, як тыдзень таму да паездкі, бяз бачных зрухаў і пераменаў. Як і раней ён хадзіў з бабуляй раз на тыдзень у Пушкінскую бібліятэку, якая месьцілася ў падвалах трохпавярховага будынка паблізу Плошчы Свабоды. Былі бібліятэкі і бліжэй да дома. Але бабуля хадзіла туды – па завядзёнцы, бо ўзгадвала, што хадзіла туды ў маладыя гады, калі толькі гэтая публічная бібліятэка была адчынена. Як і раней, бабуля кожны ранак выбіралася рваць траву для казы. Часам яна брала яго з сабой, і ён зьведаў усе яе маршруты, якія пралягалі ў старыя менскія куткі і па старых вуліцах, найменш зруйнаваных вайной, з незацертымі прыкметамі свайго старадаўняга паходжаньня. Тады Сурына крыху дзівіла, нашто хадзіць па траву да Сьвіслачы пад Траецкую гару, ці ў Слабодку на вуліцу Пуліхава, і блукаць па Ніжнім Рынку паблізу Кацярынінскай царквы на Нямізе, калі і побач, на спаленых дварах і кастрышчах былога шклозаводу буяла такая ж трава. Цяпер, маючы ўласны вопыт успамінаў пра людзей, злучанасьць памятных падзеяў з краявідамі, ён разумеў, што ранішні збор травы дапамагаў бабулі падарожнічаць у сваю мінуўшчыну. На старых вулках яна нібыта бачыла свае даўнейшыя сьляды, і памяць вяртала яе гадоў на трыццаць-сорак назад, і пад уплывам уваскрэшаных вобразаў зьнікала ў той часавай далячыні і чакала ўзьнікненьня побач ці недзе паблізу знаёмай постаці – сяброўкі з юнацкіх гадоў, тагачаснага сябра, знаёмага, нейкай добрай душы, з якой яны разам змогуць узгадаць іх лепшыя дні, шчасьлівыя хвіліны і радасную самаўпэўненасьць юнацтва... Ды праімчыць міма грузавік, абдасьць дымам, ці трапіцца на вочы шыльда з новай назвай старой вуліцы – неаспрэчны і жорсткі знак забыцьця, і расьсейваюцца ў паветры карціны чароўных успамінаў, як раней раскрышылася ў пыл спланаванае ў маладосьці шчасьце...

**10.**

Сурыну прыгадалася яшчэ адна падзея з лёсу бабулі. Магчыма, яна была вырашальная. Толькі аднойчы дакранулася бабуля да яе ў сваіх начных аднаўленьнях мінуўшчыны. Ды, канешне, акрэсьленьне “падзея” ніяк не адпавядала зьместу цьмяна асьветленага бабуляй перыяду

свайго жыцьця – найменш дзьве бяды былі сьціснутыя ў памер караценькага ўспаміну. Гэта быў успамін пра другое каханьне, пра спробу пабудаваць новае жыцьцё, увасобіць надзею на асабістае шчасьце. Сурын узгадаў імя чалавека, якое тады прагучала. Бабуля называла яго Франэк. Ён быў дарожны інжынер, ва ўсялякім разе такі быў яго занятак у Валожыне, куды бабуля ўладкавалася на працу. Ягоныя бацькі жылі ў Любліне. Адносіны з Франэкам, як разумеў цяпер Сурын, прыпалі на неспрыяльныя дзевятнаццаты-дваццаты гады. Тады бабуля з дачкой жыла ў падваліне камяніцы на былой Захар'еўскай вуліцы, перайменаванай потым у Савецкую, а потым у прасьпект Сталіна, і перайменаваны яшчэ некалькі разоў на густ чарговай улады. Нічога, зразумела, ад той вуліцы і ад камяніцы цяпер не засталося. Зараз на тым месцы тратуар каля ўваходу ў магазін "Паўлінка". Магчыма, рэшткі таго падвалу засталіся пад асфальтам – адзіныя нямыя сьведкі. Бабуля і Франэк кахалі адзін аднаго, і ў іх нарадзілася дачка, якую бабуля назвала Франкай. І ўсе разам зьбіраліся пераехаць у Люблін. Раптам Франка захварэла, хутка яе ня стала. Менск стаў савецкім, заставацца ў ім Франэк не хацеў, а бабуля не хацела ехаць з ім у Польшчу. І Франэк зьнік у невядомасьці далейшага лёсу за блізкай тады дзяржаўнай мяжой. І шчасьце разьвеялася, як дым. А бабуля засталася з памяцьцю аб каханьні, аб памёрлай дачцы, няйзьдзесьненым апошнім шчасьці, і з нейкай крыўдай на дарослую ўжо дачку, якая нібыта перашкодзіла таму лепшаму жыцьцю адбыцца. Бо гэта і быў канец асабістага жыцьця. І вось тады, яна пасівела, разумеў Сурын. Прайшоў час удачы.

Скубячы траву для казы, яна пра гэта ўспаміналa, пераносячыся праз тры дзесяцігоддзі ў свой лепшы зьніклы час. А ноччу пра гэта апавядала. Сьвятло месяца ўлівалася ў пакой і таямнічыя блакітава-тумановыя прамяні ажыўлялі дарагія яе сэрцу цені. Можа бабуля і не ўсьведамляла, што гаворыць услых, можа агучвала свае сны, ці ёй здавалася, што тое, што яна апавядае, ёй мроіцца. Час які наперадзе, заўжды здаецца доўгім, а той, што мінуў, ушчыльняецца, і тое што было і дзесяць, і трыццаць гадоў таму мае тую ж сьвежасьць, і з той жа аднолькавай сілай шчыміць сэрца. Душа не падпарадкуецца часу. Той боль даўніх пакутаў Сурын адчуваў у голасе бабулі. Інакш яна і не магла яго выказаць. Ды наўрад ці яна скардзілася. Што мог зрабіць унук, слухаючы і размалёўваючы сваім наіўным уяўленьнем бабуліны трагічныя аповеды? Ды і ніхто ня мог тут нічога зрабіць, палепшыць, зьмяніць, вярнуць назад і перайграць памылкавыя рашэньні і вырашальныя ўчынкі. А потым і спачуваць не застаецца каму. Жывыя адыходзяць, застаюцца іхнія цені. Застаецца горыч, што яны былі нешчасьлівыя. Вось яны ў свой час глядзелі на гэтую поўню, і яна азірала іх, дзівячы сваімі таямніцамі, а ўжо няма ні інжынера Франэка, ні бабулі, ні іхняга няўдалага каханьня, ні іхніх сьлёз у гадзіну бяды і ў час разьвітаньня, і няма жывых сьведкаў гэтага. Усе, каму бабуля казала, з кім дзялілася – сёстры і сяброўкі, усе ўжо там, побач з ёй, усе неяк і палеглі з невялікімі перапынкамі ў часе ў могілкі на Кальварыі, і калі стаіш перад іхнімі крыжамі, хочацца верыць, што душа бесьсьмяротная, і яны сустрэліся на небе і супакоеныя пазнаходзілі там свае галоўныя страты – дзяцей, мужоў, каханкаў, і ўсе разам, і ўсе дараваныя...

## 11.

Калі бацькі ня стала, Сурын адчуў сябе вінаватым. Гэта была не адзінкавая віна, яна таілася ў сутнасьці іх адносінаў: ён не аддаў бацьку заслужанай ім любові, шмат што перашкодзіла ім зблізіцца. Спачатку разлучыла вайна, і чатыры гады Сурын наогул ня ведаў, што азначае слова “тата”, а пасьля вайны яшчэ гадоў шэсьць запар ён бачыў бацьку, бадай што па нядзелях, і на ноч слухаў пра бабуліна жыцьцё, а не пра бацькава, і нячастыя бацькавы апавяданьні здаваліся цьмянымі, як штодзённасьць. Уласна, бацька мала што і меў паведаміць са сваёй даўніны. Пра няўдалае дзяцінства, пра смутак на вясковых вячорках, дзе ўсе хлопцы гулялі ці біліся за дзяўчат, а ён змушаны быў цярпець адзіноту. Пра маці, якую злавала яго калецтва і кпіла з ягонай прагі да ведаў. А ў сорак чацьвёртым, паслаўшы на вёску ліст і атрымаўшы адказ з раёну, што ні вёскі, ні ягонай радні няма болей на сьвеце, ён наўзрыд заплакаў, шкадуючы, што не разьвітаўся з маці і стаў грэшны...

## 12.

Сурыну хацелася ўбачыць такі сон: яны сустрэліся з бацькам, пайшлі лугавінай да возера з чырвонай вадой, прыселі на калоду пры беразе і гавораць толькі пра сваё, пра запаветнае, пра недагаворанае пры жыцьці, бяз сьпеху і змоўчваньня, якімі былі азмрочаны іхнія адносіны тут. Бо тут ім перашкодзілі. У самой сям’і, якую маці зьбівала ў суцэльнасьць, сьцягвала ў адзінства сваім упартым жаданьнем мацунку, радасьці, спакою, не супакойваліся старыя жыцьцёвыя крыўды. Усе жадалі адзін аднаму дабра, але гэтыя жаданьні неяк фатальна не збываліся, і гаркота бясьсільля, паасобнасьць, штучная весялосьць складаліся ў нязьменнасьць непапраўнага, і таму ўтоенага, няшчасьця... І канец быў прасякнуты той жа горыччу. Бацька захварэў, яго адвезьлі ў шпіталь, думалася – хутка выздаравее, як было раней, а раніцай наступнага дня затэлефанаваў дзяжурны доктар – спачуваю... І засталіся непрынятымі апошні позірк, апошняе слова, апошні стук сэрца....

Вісела над зямлёй напаленая поўня, зазірала ў вокны, непакоіла раны, і сумны жаль пра нязьдзейсьненую любоў, пра сардэчную сьлепату, мучыў Сурына. Чаму ж у гэтую хвілю, думаў ён, не прыходзіць выратавальная думка, што і яна, гэтая хвіліна, калі-небудзь уваскрэсьне ў памяці? І калі не аддаў ёй сваю любоў цалкам, дык потым пабачыш сябе грэшнікам, які, не аддорваючы, браў з чужога сэрца. І зьбяруцца гэтыя грахі сьлепаты і чэрствасьці, і пакладуцца на сэрца грузам недаравальнай віны. І ніхто не закліча да адказу, маўчаць цені, але няма сну, працінае самота, і кпліва ўсьміхаецца поўня...